ваўшы такім чынам манаполію КПСС на ўладу ў краіне. У ліпені 1990 г. адпаведныя змены былі ўнесены і ў Канстытуцыю БССР. У гэты ж час Вярхоўны Савет БССР прыняў пастанову «Аб рэгістрацыі грамадскіх аб'яднанняў у Беларускай ССР». У рэспубліцы з'явілася прававая аснова для фарміравання шматпартыйнай сістэмы.

У пачатку 1990-х гг. у Беларусі масава ствараліся палітычныя партыі. Першыя палітычныя партыі былі нешматлікімі і ў асноўным абапіраліся на інтэлігенцыю.

1. У чым праявілася «адліга» ў грамадска-палітычным жыцці БССР у другой палове 1950-х — першай палове 1960-х гг.?
2. Сфармулюйце 3 тэзісы, уключыўшы ў іх найбольш важныя, на ваш погляд, характарыстыкі грамадска-палітычнай сістэмы БССР у другой палове 1960-х — першай палове 1980-х гг.
3. У чым заключалася дэмакратызацыя грамадска-палітычнага жыцця ў БССР у другой палове 1980-х — пачатку 1990-х гг.?
4. Складзіце слоўнік гістарычных тэрмінаў, якія характарызуюць грамадска-палітычнае развіццё БССР у другой палове 1940-х — 1980-х гг. (не менш за 7 тэрмінаў). Дайце іх вызначэнні.
5. Прааналізуйце які-небудзь твор мастацтва, што адлюстроўвае жыццё ў БССР у другой палове 1940-х — 1980-я гг. Якія элементы грамадска-палітычнага жыцця таго часу паказаны ў ім?

## § 6. Станаўленне дзяржаўнага суверэнітэту Рэспублікі Беларусь

§ 6-1

§ 6-2

Калі і з якой мэтай быў створаны СССР?

**Дэкларацыя аб дзяржаўным суверэнітэце БССР ад 27 ліпеня 1990 г. і наданне ёй статусу канстытуцыйнага закону.** Рэфармаванне савецкай сістэмы ў гады перабудовы прывяло да глыбокага сістэмнага крызісу. Падзенне прадукцыйнасці працы, спыненне прадпрыемстваў, рост цэн, рэзкае зніжэнне ўзроўню жыцця насельніцтва, татальны дэфіцыт, разрыў эканамічных сувязей паміж рэгіёнамі абвастрылі супярэчнасці паміж рэспублікамі, прывялі да страты аўтарытэту СССР. Аднак кіраўніцтва СССР марудзіла з прыняццем адэкватных рашэнняў па рэфармаванні савецкай федэрацыі.

У 1990 г. пачаўся працэс абвяшчэння незалежных рэспублік («парад суверэнітэтаў»). 12 чэрвеня 1990 г. быў абвешчаны суверэнітэт Расійскай Федэрацыі, а 16 ліпеня — Украіны.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



Мітынг на плошчы Леніна ў Мінску 27 ліпеня 1990 г.

*Абмяркуйце, ці азначала прыняцце Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце БССР абвяшчэнне рэспублікай незалежнасці.*



БЮЛЛЕТЕНЬ

для голосования на референдуме СССР

17 марта 1991 года

Считаете ли Вы необходимым сохранение Союза Советских Социалистических Республик как обновленной федерации равноправных суверенных республик, в которой будут в полной мере гарантироваться права и свободы человека любой национальности.

Оставьте один из указанных ответов, другой вычеркните

ДА НЕТ

Бюллетень, в котором при голосовании вычеркнуты слова ДА и НЕТ или не вычеркнуты оба слова, признается недействительным

Бюлетэнь для галасавання на рэферэндуме СССР 17 сакавіка 1991 г.

Вярхоўны Савет БССР 27 ліпеня 1990 г. прыняў Дэкларацыю аб дзяржаўным суверэнітэце БССР. Згодна з Дэкларацыяй, на тэрыторыі рэспублікі абʼяўляліся вяршэнства Канстытуцыі і законаў БССР, паўната ўлады рэспубліканскіх дзяржаўных органаў на ўсёй тэрыторыі краіны, самастойнасць і незалежнасць Беларусі ў міжнародных стасунках. Разам з тым абвяшчалася імкненне да захавання Саюза суверэнных сацыялістычных дзяржаў на аснове новага дагавора.

**Рэферэндум па пытанні аб захаванні СССР.** У канцы 1990 — першай палове 1991 г. кіраўніцтва СССР і шэрагу саюзных рэспублік, уключаючы БССР, праводзіла падрыхтоўку да заключэння новага саюзнага дагавора. Былі падпісаны дагаворы аб супрацоўніцтве Беларусі ў розных сферах з іншымі саюзнымі


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

рэспублікамі. Па ініцыятыве М. С. Гарбачова ў сакавіку 1991 г. у 9 рэспубліках СССР (з 15), у тым ліку ў БССР, быў праведзены рэферэндум па пытанні аб захаванні абноўленага Саюза як федэрацыі раўнапраўных суверэнных Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік.

У выніку большасць грамадзян БССР (82,7 %) выказаліся за захаванне Саюза ў абноўленым выглядзе. Пачаліся перамовы аб заключэнні новага саюзнага дагавора паміж тымі рэспублікамі, насельніцтва якіх на рэферэндуме падтрымала ідэю захавання СССР.

*Як вы можаце патлумачыць жаданне большасці беларусаў захаваць СССР? Пры магчымасці пагаварыце з членамі вашай сям'і, якія ўдзельнічалі ў галасаванні, і высветліце іх пункт гледжання па гэтым пытанні.*

**Белавежскія пагадненні. Стварэнне СНД.** Ва ўмовах падрыхтоўкі новага саюзнага дагавора група вышэйшых партыйных і дзяржаўных чыноўнікаў у Маскве ў жніўні 1991 г. здзейсніла спробу дзяржаўнага перавароту, спрабуючы захаваць непахіснасць савецкай сістэмы. Быў створаны Дзяржаўны камітэт па надзвычайным становішчы (ДКНС) у СССР, але спроба сілавога вырашэння праблемы правалілася і значна паскорыла працэс распаду СССР.

26 жніўня 1991 г. была прыпынена дзейнасць КПСС — КПБ. Быў прыняты закон аб дэпартызацыі органаў дзяржаўнай улады, прадпрыемстваў, арганізацый, нацыяналізацыі партыйнай маёмасці.

19 верасня 1991 г. дэпутаты Вярхоўнага Савета БССР прынялі рашэнне перайменаваць БССР у Рэспубліку Беларусь. Тады ж былі зацверджаны новыя дзяржаўныя сімвалы Рэспублікі Беларусь — бел-чырвона-белы сцяг і герб «Пагоня». Но-

У самым цэнтры Белавежскай пушчы размясцілася невялікая вёсачка Віскулі. У 1950-я гг. у Віскулях быў пабудаваны комплекс будынкаў, які служыў паляўнічай рэзідэнцыяй кіраўнікоў СССР. У канцы 1991 г. гэтае месца раптоўна стала вядомым усяму свету.

Складзіце храналагічную табліцу «Станаўленне дзяржаўнага суверэнітэту Рэспублікі Беларусь». Выберыце і пракаменціруйце тыя падзеі, якія вы лічыце асноватворнымі ў гэтым працэсе.



Рэзідэнцыя «Віскулі». Пружанскі раён, Брэсцкая вобласць

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

вая сімволіка ўводзілася рашэннем парламента, без правядзення рэферэндуму альбо іншага апытання грамадскага меркавання.

У Белавежскай пушчы, у рэзідэнцыі «Віскулі», 8 снежня 1991 г. кіраўнікі Беларусі, Расійскай Федэрацыі і Украіны без запрашэння іншых заснавальнікаў СССР дэнансавалі Саюзны дагавор 1922 г. і падпісалі Пагадненне аб стварэнні Садружнасці Незалежных Дзяржаў (СНД). Гарантаваліся адкрытасць межаў, свабода перамяшчэння грамадзян і перадачы інфармацыі ў межах Садружнасці. Пазней на сустрэчы прэзідэнтаў у Алма-Аце да СНД далучыліся яшчэ восем рэспублік. Пагадненне, падпісанае ў г. Алма-Ата, стала асновай СНД. Мінск вызначаўся як афіцыйнае месца знаходжання каардынуючых органаў Садружнасці. 25 снежня Прэзідэнт СССР М. С. Гарбачоў склаў свае паўнамоцтвы.

**Прычыны распаду СССР.** Прычынамі спынення існавання СССР з'яўляюцца грубыя памылкі палітычнага кіраўніцтва краіны, унутраная барацьба за ўладу паміж М. С. Гарбачовым і Б. М. Ельцыным, рост нацыяналістычных настрояў і нежаданне асобных рэспублік падпарадкоўвацца цэнтру, непрадуманыя, а таму няўдалыя эканамічныя рэформы, а таксама непасрэдная зацікаўленасць заходніх дзяржаў у аслабленні і ліквідацыі Савецкага Саюза.

Распад СССР палітыкі сёння называюць буйнейшай геапалітычнай катастрофай XX ст. Яна прывяла да шматлікіх узброеных канфліктаў паміж былымі братэрскімі савецкімі рэспублікамі, кровапралітных грамадзянскіх войнаў, знішчэння цэлых галін прамысловасці і сельскай гаспадаркі, з'яўлення ценявой эканомікі і арганізаванай злачыннасці, дэмаграфічных праблем і беднасці.

Наступствы распаду Савецкага Саюза пераадольваліся больш за дзесяцігоддзе.

**Прыняцце Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь 15 сакавіка 1994 г.** Важнейшым этапам станаўлення і далейшага развіцця дзяржавы з'яўляецца распрацоўка Канстытуцыі. **Канстытуцыя** — Асноўны Закон дзяржавы, які вызначае яе грамадскае і дзяржаўнае ўладкаванне, прынцыпы арганізацыі і дзейнасці органаў дзяржаўнай улады і кіравання, асноўныя правы і абавязкі грамадзян. У ліпені 1990 г. Вярхоўны Савет БССР стварыў Канстытуцыйную камісію для распрацоўкі праекта Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь. У яе склад увайшлі 61 дэпутат і 13 спецыялістаў у галіне права. Праект Канстытуцыі, па сутнасці, быў гатовы да сярэдзіны 1991 г. У працэсе падрыхтоўкі праекта Канстытуцыі было вывучана каля пяцісот атрыманых прапаноў і заўваг, з якіх больш за сотню ўлічылі.

*Вызначце моцныя і слабыя бакі кожнай з дзвюх мадэляў рэспубліканскай формы кіравання.*

Характэрнай асаблівасцю працэсу станаўлення суверэннай Беларусі з'яўлялася тое, што незалежная дзяржава абвяшчалася ў форме парламенцкай рэспублікі. У той жа час


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

з'явіліся новыя дзяржавы — прэзідэнцкія рэспублікі. У Вярхоўным Савеце, у Канстытуцыйнай камісіі і ў грамадстве разгарнулася дыскусія пра тое, якой мае быць беларуская дзяржава: парламенцкай рэспублікай альбо прэзідэнцкай?



Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнка

Прынятая 15 сакавіка 1994 г. Вярхоўным Саветам Канстытуцыя ўвяла ў рэспубліцы інстытут прэзідэнцтва. Прэзідэнт абвяшчаўся кіраўніком дзяржавы і выканаўчай улады; яму прадастаўлялася права фарміравання ўрада, кантролю над асноўнымі дзяржаўнымі структурамі. Прэзідэнт павінен быў абірацца на пяць гадоў непасрэдна народам Рэспублікі Беларусь на аснове ўсеагульнага, свабоднага, роўнага і прамога выбарчага права пры тайным галасаванні. Разам з тым захоўваліся значныя правы Вярхоўнага Савета, у тым ліку права зацвярджэння ўрада, фарміравання саставу вышэйшых органаў судовай улады, манаполія на прыняцце дзяржаўных законаў. Уводзіўся новы вышэйшы орган судовай улады — Канстытуцыйны Суд, які фарміраваўся Вярхоўным Саветам.

Канстытуцыя прадугледжвала магчымасць правядзення рэферэндумаў для вырашэння найбольш важных пытанняў дзяржаўнага і грамадскага жыцця.

**А. Р. Лукашэнка — першы Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь.** У адпаведнасці з Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь 23 чэрвеня 1994 г. адбыліся выбары Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Кандыдатамі на пост прэзідэнта былі вылучаны шэсць чалавек. Асноўнымі канкурэнтамі сталі прэм'ер-міністр В. Ф. Кебіч, які цалкам кантраляваў дзяржаўныя СМІ, абапіраўся на дзяржаўны апарат і яго кадры, і дэпутат Вярхоўнага Савета А. Р. Лукашэнка. Яго перадвыбарчая праграма знайшла шырокую падтрымку сярод грамадзян. У ёй рабіўся акцэнт на пераадоленні эканамічнага крызісу, сацыяльнай справядлівасці, барацьбе з карупцыяй, павышэнні жыццёвага ўзроўню насельніцтва, аднаўленні на раўнапраўнай і ўзаемавыгаднай аснове сувязей з дзяржавамі, якія раней уваходзілі ў склад СССР, перш за ўсё з Расіяй і Украінай.

Пераможцам першага тура выбараў стаў А. Р. Лукашэнка, які набраў 45 % галасоў. В. Ф. Кебіча, хаця ён і выйшаў у другі тур, падтрымала толькі 17,4 % выбаршчыкаў. У наступным туры выбараў, які адбыўся 10 ліпеня 1994 г., каля 80 % выбаршчыкаў першым Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь абралі А. Р. Лукашэнку.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ




Дзяржаўны сцяг і Дзяржаўны герб Рэспублікі Беларусь, зацверджаны па выніках рэспубліканскага рэферэндуму 1995 г.

Па ініцыятыве Прэзідэнта была вызначана новая арганізацыйная структура ўрада і сфарміраваны новы Савет Міністраў. У адпаведнасці з Канстытуцыяй быў сфарміраваны таксама новы орган дзяржаўнага кіравання — Адміністрацыя Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, закліканая забяспечваць арганізацыйную, інфармацыйную, экспертна-аналітычную і прававую дзейнасць кіраўніка дзяржавы, узаемадзеянне Прэзідэнта з галінамі ўлады, грамадскімі і рэлігійнымі арганізацыямі і аб’яднаннямі, іншымі грамадска-палітычнымі інстытутамі, а таксама са сродкамі масавай інфармацыі, ажыццяўляць кантроль за выкананнем яго рашэнняў. Па Канстытуцыі Прэзідэнт узначаліў Савет бяспекі — міжведамасны орган, упаўнаважаны распрацоўваць узгодненыя меры падтрымання бяспекі дзяржавы.

**Рэспубліканскі рэферэндум 14 мая 1995 г. і яго вынікі.** У адпаведнасці з Канстытуцыяй Прэзідэнт з’яўляўся кіраўніком дзяржавы і выканаўчай улады. Вярхоўны Савет выконваў заканадаўчыя функцыі. Аднак у хуткім часе сталі праяўляцца закладзеныя ў Асноўным Законе Рэспублікі Беларусь палітычныя супярэчнасці. У Канстытуцыі 1994 г. не быў створаны механізм пераадолення крызісных сітуацый, якія ўзнікалі ва ўзаемаадносінах паміж выканаўчай і заканадаўчай уладамі. У грамадстве ўсё часцей гучала крытыка і выказвалася незадаволенасць працай Вярхоўнага Савета.

14 мая 1995 г. па ініцыятыве Прэзідэнта быў праведзены рэспубліканскі рэферэндум.

На рэферэндум выносіліся пытанні, якія выклікалі найбольш вострыя дыскусіі ў грамадстве: аб статусе рускай мовы, аб дзяржаўнай сімволіцы і аб эканамічнай інтэграцыі з Расіяй. Акрамя гэтых пытанняў на рэферэндум выносілася пытанне аб унясенні змен у Канстытуцыю, якія прадугледжвалі магчымасць датэрміновага спынення паўнамоцтваў Вярхоўнага Савета Прэзідэнтам у выпадках сістэматычнага альбо грубага парушэння Канстытуцыі. Па ўсіх чатырох пытаннях большасць грамадзян падтрымала пазіцыю Прэзідэнта.

**1.** Навукоўцы-гісторыкі выказваюць меркаванне, што «адмена арт. 6 Канстытуцыі СССР у лютым 1990 г. стала адной з прычын распаду СССР».


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Ці існуе, па вашым меркаванні, сувязь паміж гэтымі гістарычнымі фактамі? Сваё меркаванне аргументуйце.

**2.** Як вы думаеце, чаму, нягледзячы на выніकі рэферэндуму па пытанні аб захаванні СССР, Савецкі Саюз спыніў сваё існаванне? Выкажыце сваё стаўленне да гэтай падзеі.

**3.** Як вы разумееце тэзіс: «Важнейшым этапам станаўлення і далейшага развіцця дзяржавы з'яўляецца распрацоўка Канстытуцыі»?

**4.** Складзіце палітычны партрэт першага Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнкі.

**5.** Знайдзіце інфармацыю пра вынікі рэспубліканскага рэферэндуму 1995 г. Якімі фактарамі, па вашым меркаванні, яны маглі быць абумоўлены?

## § 7. Грамадска-палітычнае жыццё ў другой палове 90-х гг. ХХ ст. — пачатку ХХІ ст.

§ 7-1

§ 7-2

Назавіце асноўныя этапы атрымання незалежнасці Рэспублікай Беларусь.

**Развіццё грамадска-палітычнай сістэмы Рэспублікі Беларусь. Фарміраванне галін дзяржаўнай улады.** Канстытуцыя 1994 г. абвяшчала Рэспубліку Беларусь унітарнай дэмакратычнай сацыяльнай прававой дзяржавай, якая валодае вяршэнствам і паўнатою ўлады на сваёй тэрыторыі. У Канстытуцыі абвяшчалася, што дэмакратычны лад у дзяржаве грунтуецца на прынцыпе падзелу ўлад на заканадаўчую, выканаўчую і судовую.

Па Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь 1994 г. вышэйшым прадстаўнічым пастаянна дзеючым і адзіным заканадаўчым органам дзяржаўнай улады з'яўляўся Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь.

**Паўнамоцтвы Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь па Канстытуцыі 1994 г.:**

- прыняцце і змяненне Канстытуцыі;
- прызначэнне рэферэндумаў і выбараў дэпутатаў Вярхоўнага Савета і мясцовых Саветаў дэпутатаў; выбараў Прэзідэнта;
- абранне вышэйшых судоў рэспублікі, Генпракурора, Старшыні і Савета Кантрольнай палаты Беларусі, Старшыні і Праўлення Нацыянальнага банка Беларусі;
- роспуск мясцовых Саветаў;
- вызначэнне асноўных кірункаў унутранай і знешняй палітыкі;
- вызначэнне ваеннай дактрыны Беларусі, а таксама аб'яўленне вайны і заключэнне міру;
- права адхілення Прэзідэнта ад пасады ў выпадку парушэння ім Канстытуцыі і інш.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ